ПАДЗЕЯ



# МУЗЫКА ПАМЯЦІ Ў СЭРЦАХ ГУЧЫЦЬ

**Член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Таццяна Яцук, а таксама дэлегацыя Баранавіцкага літаратурнага аб’яднання «Купальскія зоры», якім яна кіруе, прынялі ўдзел у фестывалі бардаўскай і аўтарскай песні «Музыка сэрцаў», прысвечаным памяці У. С. Высоцкага.**

На маляўнічым беразе легендарнага возера Літоўка, якое знаходзіцца на тэрыторыі Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці, штогод праводзіцца маштабнае свята творчасці. Яно традыцыйна прымеркавана да дня памяці ўсенародна любімага артыста, вядомага акцёра тэатра і кіно, паэта, барда Уладзіміра Высоцкага (1938-1980). Уладзімір Сямёнавіч, дарэчы, у свой час пабываў у гэтых мясцінах на здымках кінастужкі «Сыновья уходят в бой» (1969, рэжысёр Віктар Тураў).

Фестываль бардаўскай і аўтарскай песні «Музыка сэрца» набыў вялікую папулярнасць і штогод прырастае новымі ўдзельнікамі і гасцямі. Ён дае магчымасць аўтарам і выканаўцам у жанры бардаўскай песні пазнаёміць слухачоў са сваёй творчасцю і нязменна адкрывае новыя імёны.

25 ліпеня бягучага года паэты літаратурнага аб’яднання «Купальскія зоры» г. Баранавічы на чале з членам Саюза пісьменнікаў Беларусў, паэтэсай Таццянай Мікалаеўнай Яцук выступілі на музычна-паэтычнай сустрэчы прыхільнікаў творчасці легендарнага артыста, сабраўшы на лакацыі Навагрудскай раённай бібліятэкі неабыякавых да паэзіі гасцей фестывалю.

**Наталля НЕСЦЯРУК**

**На фота:** творцы з вядомага гродзенскім аматарам мастацкага слова літаб’яднання «Купальскія зоры» пад кіраўніцтвам члена СПБ, паэтэсы-педагога Таццяны Яцук – на фестывалі бардаўскай і аўтарскай песні «Музыка сэрцаў», прысвечаным памяці У. С. Высоцкага. Навагрудскі раён, Гродзенская вобласць, 25 ліпеня 2026 года.



На фестывалі бардаўскай песні – паэты Аляксей Белы, Наталля Несцярук, Таццяна Яцук, Юрась Мазалевіч






**Баранавіцкая паэтка Наталля Несцярук на Навагрудчыне**







**З дырэктарам Навагрудскай раённай бібліятэкі Ірынай Міхайлаўнай Царук**